

ЗВЯРНУЦЦА ПА ДАПАМОГУ І АТРЫМАЦЬ



ВІЦЕБСК — ГОРАД МАСТАКОЎ...

11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЛЮТАГА 2024 г.
СЕРАДА
№ 36 (30170)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- **У 2023 годзе статус рэзідэнта СЭЗ атрымалі 30 новых кампаній.**
- БУТБ: біржавыя таргі спрашчаюць для суб'ектаў МСП пошук бізнес-партнёраў і зніжаюць рызыкі.
- **«АМКАДОР» абмеркаваў перспектывы супрацоўніцтва з Цюменскай вобласцю.**
- Маладзечна прымае X Форум маладых кампазітараў Беларусі і краін СНД.
- **Зборная Беларусі па пляжным футболе перамагла калумбійцаў на чэмпіянаце свету.**
- Дызайнеры-фіналісты «Млына моды» ўдзельнічаюць у міжнароднай выставе Collection Premier Moscow.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

*«Міжнародных назіральнікаў за выбарамі на сёння акрэдытавана 246. Вялікая група назіральнікаў ад краін СНД — як ад Выканкама СНД, так і ад парламенцкіх структур. Акрамя гэтага, ёсць міжнародныя назіральнікі ад Парламенцкай асамблеі АДКБ, ад Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Прадстаўлены цэнтральныя выбарчыя органы як краін СНД, так і іншых краін, напрыклад Пакістана. Сумесна з МЗС мы працуем па акрэдытацыі назіральнікаў — індывідуальных экспертаў з краін ЕС».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «НЕ ПРОСТА РЭАЛЬНА АЦЭНЬВАЦЬ АБСТАНОЎКУ І РАЗУМЕЦЬ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА, АЛЕ І АПЕРАТЫЎНА ДЗЕЙНІЧАЦЬ»

### Якія задачы Прэзідэнт паставіў перад кіруючым саставам дзяржаўных органаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі

**На пачатку пашыранай нарады, якая адбылася ў Цэнтральным доме афіцэраў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сустрэча ў такім саставе з'яўляецца пэўным арыенцірам на будучыню, дазволіць сарыентаваць, у якім ключы праводзіць выніковыя калегіі сілавых структур. Найбольш вострыя пытанні ў сферы нацыянальнай бяспекі абмяркоўваліся адкрыта і па-мужчынску. На пашыранай нарадзе максімальна аб'ектыўна, без прыкрас ацанілі рэальную абстаноўку, якая складваецца ў Беларусі і вакол нашай краіны.**

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што кожны на сваім узроўні ведае абстаноўку, але прапанаваў паглядзець на яе праз прызму экзістэнцыяльных пагроз, якія ўзніклі не сёння і не ўчора. Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што мала іх бачыць. Трэба разумець глабальную палітычную кан'юнктуру, аб'ектыўна ацэньваць прычыны і перадумовы. Асабліва цяпер, калі свет зноў падышоў да краю прорвы.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# Прагаласавалі — і ўвайшлі ў гісторыю




Учора ў Беларусі пачалося датэрміновае галасаванне на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і мясцовых Саветаў.

Навучэнцы другога і трэцяга курсаў Мінскага філіяла Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі Ірына НОВІКАВА, Ірына КРУГЛІК, Канстанцін СКІЦЁЎ, Арцём ВОЛКАЎ і Арына ПАРФЯНОВІЧ пасля сёлетніх выбараў увойдуць у гісторыю, бо выбарчая кампанія для маладых людзей — двойчы першая. Асабіста для іх — першая ў жыцці, а для краіны — першая з Адзіным днём галасавання.

На памяць аб гэтай падзеі дырэктар навучальнай установы Алег ЛЕЎШУНОЎ уручыў юнакам і дзяўчатам сувеніры і падарункавыя выданні Галоўнага закона краіны — Канстытуцыі.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Размова па сутнасці

# «СТАРАЖЫТНАЯ. ТЫ САМАЯ СЛАВЯНСКАЯ...»?

### Іншаземныя словы ў беларускай мове: на карысць ці на шкоду?

**Пытальнік у загалоўку пасля вядомай цытаты з верша Пімена Панчанкі мы паставілі нездарма. Беларуская мова сапраўды лічыцца адной з самых блізкіх да старажытнай мовы ўсходніх славян, у яе сучасным варыянце і сёння нямала слоў, якія сустракаюцца ў старых летапісах (тое ж «вельмі», яго няма сёння ні ў рускай, ні ва ўкраінскай, і такіх прыкладаў, калі ставіць мэту, можна прывесці даволі шмат). Але хапае ў нашай мове і слоў чужых, запазычаных, якія ўжываюцца і дарэчы, і не дарэчы. Вядома, без многіх з іх ніяк не абыдзешся, але ж іншыя мову відавочна псуюць...**

СТАР. 12-13



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.